This article is distributed under the terms of the Creative Commons Attribution 3.0 PL
© Copyright by Uniwersytet Warszawski Katedra Studiów Interkulturowych Europy Środkowo-Wschodniej & individual articles to their Authors

doi: 10.32612/uw.2543618X.2024.pp.125-143

Przegląd Środkowo-Wschodni, 9, 2024
ISSN 2543-618X eISSN 2545-1324

Nr art. 20240906

Data przesłania: 05.06.2024
Data akceptacji: 27.06.2024

**Андрэй Мастыка**
Цэнтр Чэслава Мілаша
ва Універсітэце Вітаўта Вялікага, Каўнас
mastyka@gmail.com
ORCID 0000-0002-1245-9113

# Месца і значэнне памяці аб Акце 25 сакавіка для беларускага студэнцкага руху ў міжваеннай Вільні

**Miejsce i znaczenie pamięci o Akcie 25 Marca dla białoruskiego ruchu studenckiego w międzywojennym Wilnie**

W artykule podjęto próbę zbadania roli i znaczenia Aktu z 25 marca 1918 roku oraz dnia ogłoszenia niepodległości Białoruskiej Republiki Ludowej jako ważnego wydarzenia historycznego dla społeczności białoruskich studentów Uniwersytetu Stefana Batorego w Wilnie (1919-1939). Na podstawie opracowania pisma studenckiego dowiadujemy się, jakie miejsce w pamięci historycznej młodzieży białoruskiej zajmowało święto niepodległości BRL, jak idee i zasady zapisane w ustawie z 25 marca wpłynęły na świadomość, ideologię i przekonania polityczne studentów oraz jak zmieniała się ta postawa pod wpływem przemian społeczno-politycznych w okresie międzywojennym.
Słowa kluczowe: Uniwersytet Stefana Batorego, białoruski ruch studencki, Białoruski Związek Akademicki, „Studenckaja Dumka", korporacja «Skarynia», „Novaja Varta", „Szlach Moładzi", „25 Sakavika"

Аднаўленне дзейнасці ўніверсітэта ў Вільні ў 1919 г. дало магчымасць моладзі з Заходняй Беларусі, якая на той момант уваходзіла ў склад польскай дзяржавы, атрымліваць вышэйшую адукацыю непасрэдна ў межах свайго краю. Такім чынам, з першага года ўтварэння Універсітэта Стэфана Баторыя (УСБ) у Вільні фарму-

ецца група беларускіх студэнтаў, якая на працягу міжваеннага часу ператварылася ў паўнавартасную супольнасць, якая стварыла ўласную арганізацыйную структуру, мела рэпрэзентатыўныя друкаваныя органы, а таксама ўласную традыцыю беларускага студэнцтва.

Дадзеная беларуская моладзевая супольнасць фармавалася ў асяроддзі, якое вылучалася пэўнымі важнымі асаблівасцямі. Менавіта ў Вільні ў той час знаходзіўся цэнтр беларускага нацыянальнага рух Заходняй Беларусі, дзе адбываліся найбольш важныя падзеі сацыяльна-палітычнага жыцця і знаходзіліся асноўныя грамадскія і культурныя арганізацыі, друк і г.д. Студэнцтва воляй-няволяй было ўключана ў нацыянальныя працэсы як найбольш актыўная і адукаваная частка грамадскасці. Адначасова ў асобах сваіх дзеячаў і ўласных арганізацый студэнцтва ўсведамляла сваё значэнне і ролю, якую яно адыгрывала ў жыцці грамадства. Таму студэнцкаму руху важна было заняць сваю пэўную грамадзянскую пазіцыю і быць арганізаваным так, каб прадстаўляць сапраўдную згуртаваную сілу. Гэта значыць закласці ў падмурак сваёй супольнасці моцныя кансалідуючыя асновы, якія забяспечвалі бы яе адзінства пры магчымай разнастайнасці палітычных арыентацыяй яе прадстаўнікоў.

З іншага боку, беларускія студэнты знаходзіліся ў «чужародным» культурным асяроддзі, бо ўніверсітэт быў польскім, таму ў пэўным сэнсе накіраваны на правядзенне як грамадзянскай, так і культурнай «паланізацыі» сярод сваіх навучэнцаў. Вядома, нельга сказаць, што польская культура, якая на той момант заставалася культурай вышэйшых сацыяльных слаёў на гэтых землях, была чымсьці абсалютна чужым для беларусаў. Аднак у эпоху росквіту нацыяналізму і канкурэнцыі розных нацыянальных праектаў, для нацыянальна-свядомых прадстаўніка беларускага грамадства дамінаванне польскай культуры было пагрозай і аб’ектам супрацьстаяння. У той жа час універсітэт пазіцыянаваў сябе прадаўжальнікам слаўных традыцый былога Віленскага ўніверсітэта, наступніка Віленскай езуіцкай акадэміі, і захавальніка вялікай культурнай спадчыны,

якая ўспрымалася як важны складнік польскай гістарычнай спадчыны. У дадатак да ўсяго, польская студэнцкая моладзь мела багаты гістарычны досвед самаарганізацыі, якая вяла свае пачаткі ад тайных студэнцкіх таварыстваў філаматаў і філарэтаў Віленскага ўніверсітэта. На той момант польскае студэнцтва ўжо мела багатую ўласную традыцыю, якая паўставала ў XIX ст. у польскім студэнцкім руху, як у самой Польшчы, так і ўніверсітэтах Аўстра-Венгрыі і Расіі[1]. У гэтым сэнсе студэнты-беларусы, якія толькі пачыналі разбудоўваць сваю нацыянальнага супольнасць, саступалі палякам.

Усе гэтыя абставіны мелі непасрэднае ўздзеянне як на фармаванне арганізацыйных структур студэнцкага руху беларусаў, так і на самаакрэсленне і тоеснасць моладзі, а таксама падштурхвала да вынаходніцтва ўласнай традыцыі. У гэтым артыкуле мы хацелі б разглядзець месца і значэння Акта 25 сакавіка і падзей паўстання Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР) як выбітнай гістарычнай падзеі і памятнай даты для супольнасці беларускіх студэнтаў УСБ. Паспрабуем адказаць на пытанне: якое значэнне гэтая падзеі мелі для гістарычнай памяці нацыянальна-арыентаванай моладзі і як прынцыпы Акта 25 сакавіка ўплывалі на ідэйна-палітычныя пераконанні беларускага студэнцтва? Асноўнай крыніцай даследавання будзе студэнцкі перыядычны друк, які выходзіў у міжваеннай Вільні.

Пераходзячы да аналізу друкаваных выданняў беларускіх студэнцкіх арганізацый, неабходна адзначыць, што асаблівасць гэтых часопісаў заключалася ў тым, што яны мелі карпаратыўны характар, былі прызначаныя ў першую чаргу для ўнутранага карыстання. Да асноўнай мэты, якую ставілі перад сабой дадзеныя выданні, можна аднесці выкананне так званых ідэйна-выхаваўчых функцый сярод сваіх сяброў. Задачы гэтага выхавання былі: 1) Фарміраванне грамадзянскай пазіцыі і вызначэнне адказнасці, якую нясе перад

---

[1] P. Tomaszewski, *Polskie korporacje akademickie w latach 1918–1939,* Toruń 2011, s. 33–38.

грамадствам студэнт як асоба, якая валодае неабходнымі якасцямі і магчымасцямі для артыкуляцыі інтарэсаў мас насельніцтва. 2) Выпрацоўка агульнай платформы, на якой у сітуацыі складанай унутрыпалітычнай абстаноўкі ў нацыянальным руху, можна было б захаваць ідэалагічнае адзінства студэнцтва. 3) Стварэнне пачуцця згуртаванасці і духу карпаратывізму. Дасягненне гэтых мэт, у сваю чаргу, дазволіла б вырашыць галоўную задачу, якая стаіць перад арганізатарамі беларускага студэнцкага руху, – фармуляванне і стварэнне ўласнай традыцыі. Наяўнасць уласных традыцый надавала беларускаму студэнцтву сваю пэўную місію і месца ў жыцці грамадства, якое выносіць яго за дужкі палітычнай фрагментаванасці, надавала агульнанацыянальнае значэнне.

У сувязі з гэтым студэнцкі друк можа нам прадэманстраваць, якія менавіта гістарычныя сюжэты, выбітныя гістарычныя постаці або важныя грамадска-палітычныя з'явы і падзеі ўключаліся ў аснову гэтай традыцыі. Таксама мы можам вызначыць тыя нацыянальныя культурныя каштоўнасці і месцы памяці, якія былі здольныя інтэграваць і згуртаваць беларускую студэнцкую моладзь розных ідэйных поглядаў і пазіцый, а ў прыватнасці, месца Акта 25 сакавіка ў гэтай сістэме каштоўнасцяў.

У дадзенай працы мы даследавалі найперш тыя выданні, якія з'яўляліся афіцыйнымі органамі беларускай студэнцкай супольнасці і яе кіраўніцтва – Беларускага студэнцкага саюза (БСС). На працягу свайго існавання ў 1921–1939 гг. арганізацыяй выпускаліся часопісы: «Наш Шлях», «Студэнцкая думка», а таксама дадатак да часопіса «Крыніца» – «Студэнцкая трыбуна» і да часопіса «Шлях моладзі» – «Шлях беларускага студэнта», аднаднёўка «Голас студэнта»[2]. А таксама разглядаліся выданні, якія публікаваліся розныя

[2] «Наш шлях: штомесячнік беларускага студэнцтва», 1922; «Студэнская думка: грамадзка-навуковы і літэратурны месячнік беларускага студэнства», 1924–1926, 1928–1930, 1935; «Студэнская трыбуна: дадатак да «Крыніца»», 1932–1937; «Šlach biełaruskaha studenta: dadatak da „Šlachu moladzi"», 1938–39; «Голас студэнта», 1937; «Шлях моладзі», 1929–1939; «25 сакавіка», 1936–1939.

ідэалагічныя кірункі студэнцкай моладзі і прадстаўлялі іх пазіцыю ды бачанне, такі як: «Шлях моладзі», «25 сакавіка».

Сярод памятных дат і падзей 25 сакавіка 1918 года, безумоўна, з'яўлялася галоўнай датай, якая станавілася прадметам святкавання і культурных мерапрыемстваў. Сам Акт 25 сакавіка займаў важнае месца як сімвалічная з'ява, і з'яўляўся ідэйнай падставай у фармаванні ўласнай традыцыі беларускага студэнцтва, але з развіццём руху і зменамі ў палітычнай сітуацыі трактоўкі падзеі і яго значэнне пэўным чынам змяняліся.

У 1922 г. пабачыў свет часопіс „Наш шлях" – першае друкаванае выданне беларускіх студэнтаў. Першы нумар «Нашага шляху» быў прысвечаны 4-м угодкам Акту 25 сакавіка. Адпаведна мы бачым, што ўжо на самым пачатку фармавання ўласнай традыцыі студэнцтва ставіць ў цэнтр гэтую падзею, як пункт адліку на яшчэ толькі распачатым шляху да незалежнасці, і як асноўную святочную дату ў жыцці народа – «Вялікае свята»[3]. Паўстанне ж незалежнай беларускай дзяржавы вызначалася як факт, які мусіць абавязкова і найхутчэй здзейсніцца, і моладзь павінна неадкладна ўключыцца ў гэтае ажыццяўленне як «будаўнічыя сваёй беларускай Бацькаўшчыны»[4].

Важнай адметнасцю было тое, што ў першыя гады пасля адкрыцця ўніверсітэта ў шэрагах беларускіх студэнтаў патрапіла досыць актыўная моладзь, у тым ліку ўжо досыць сталыя, ці, прынамсі, дасведчаныя асобы, якія ўжо бралі ўдзел у грамадска-палітычным жыцці, у рэвалюцыйных падзеях і нацыянальным руху[5]. Характэрна, што рэдактарам-выдаўцом «Нашага Шляху» і аўтарам асобных праграмных артыкулаў з'яўляўся Браніслаў Ту-

[3] А. Навіна, *Вялікае свята*, „Наш шлях: штомесячнік беларускага студэнцтва" 1922, №1, с. 17–20.

[4] М. Крывічонак, *Шляхі беларускай студэнцкай моладзі*, „Наш шлях: штомесячнік беларускага студэнцтва" 1922, №1, с. 3–4.

[5] А. Мастыка, *Беларускі студэнцкі саюз у культурна-асветніцкім жыцці Заходняй Беларусі (да 100-годдзя заснавання арганізацыі),* „Przegląd Środkowo-Wschodni" 2021, Т. 6, с. 150–151.

ронак (псеўданімы М. Крывічонак, М. Крушына). На момант паступлення ва ўніверсітэт ён меў 23 гады[6], у гэтым узросце гэта ўжо была дасведчаная асоба ў нацыянальным руху, арганізатар беларускага школьніцтва, прыхільнік Беларускай хрысціянскай дэмакратыі (БХД)[7].

Таму агульная характарыстыка выдання тагачаснага часопісу можна даць як органу прагрэсіўнай моладзі, якая ў сваіх памкненнях была арыентаваная не столькі на гістарыка-культурную традыцыю і спадчыну, колькі на актыўныя сацыяльна-палітычныя пераўтварэнне і ўвесь свае надзеі і імпэт скіроўвала на хуткія пазітыўныя змены ў краіне. Таму змест і пафас матэрыялаў часопісу можна акрэсліць як заахвочванне і наўпроставая агітацыя да актыўнай грамадскай дзейнасці і палітычнай уключанасці з поўнай упэўненасцю на хуткае дасягненне мэт і ідэалаў Акту 25 сакавіка.

Такая пазіцыя моладзі вынікала з тагачаснага грамадска-палітычнага кантэксту. 1922 год – гэта перыяд актыўная парламенцкая барацьбы ў Польшчы (выбары ў Сойм і Сенат), на той момант яшчэ вызначаўся лёс такога квазі-дзяржаўнага ўтварэнне як Сярэдняя Літва, з якім народы Віленскага краю звязвалі магчымасці сваёй незалежнасці, або, прынамсі, аўтаноміі ў складзе Польшчы. Але паступова рэчаіснасць прымушала ад ідэалістычнага бачання вяртацца да больш прагматычных планаў і ацэнкі сітуацыі.

Спробы пераасэнсавання і глыбейшай прапрацоўкі падзей 1918 года і значэння Акта 25 сакавіка мы бачым ужо ў публікацыі 1925 года. У артыкуле «Абвяшчэнне незалежнасці Беларусі ў святле ідэі гаспадарсцвенасці»[8] адзначаным падзеям надаецца пэўнае гісторыка-філасофскае абгрунтаванне. Тут фармулюецца думка, што Акт

---

[6] Lietuvos centrinis valstybės archyvas [далей: LCVA], f. 175, ap. 3IXD, b. 10(120): Akta osobowe studenta Turonka Bronisława;

[7] Ю. Туронак, *Памяці Браніслава Туронка,* [у:] Мадэрная гісторыя Беларусі, Вільня 2006, с. 93–94.

[8] *Абвяшчэнне незалежнасці Беларусі ў святле ідэі гаспадарсцвенасці*, „Студэнская думка” 1925, №2(3), с. 2–9.

25 сакавіка быў зацвярджэннем і замацаваннем права на гістарычнае існаванне беларускага народа як дзяржаўнай нацыі. Праз кароткі агляд гісторыі Беларусі даказваецца, што ўся гісторыя была скіравана на стварэнне ў выніку ўласнай беларускай дзяржавы, а абвяшчэнне незалежнай БНР – квінтэсэнцыя гэтага шляху, гэтага памкнення, што пацвярджае дзяржаўніцкі характар беларускага нацыі і права мець ўласную дзяржаву. Паралельна раскрываецца пытанне аб вартасці сваёй дзяржаўнасці, неабходнасці яе калі не ва ўласна існуючай форме, то хоць наяўнасць яе ў гістарычным мінулым, што забяспечвае сучаснае існавання і гарантуе будучае для народа.

Пры гэтым моладзь таксама звяртаецца да вынаходніцтва ўласнай гістарычнай традыцыі, у тым ліку пошуку вытокаў студэнцкага руху, але гістарычныя ўяўленні студэнцтва пакуль не сягаюць надта глыбока. У 4-м нумары «Нашага шляху» апублікаваны артыкул «Студэнцкая моладзь у беларускім руху»[9]. Гэта была першая спроба на старонках друку беларускага студэнцтва прасачыць сваю генеалогію. Першапачатковы генезіс гэтага руху выводзіўся са студэнцкага асяроддзя расійскіх універсітэтаў Пецярбурга і Масквы ў 80–90-я гг. XIX ст. Паўнавартаснымі арганізаванымі формамі нацыянальнага студэнцкага руху называліся беларускія гурткі, якія ўзніклі ў пачатку XX ст. у Пецярбургу, у прыватнасці, як найбольш ранні адзначаўся «гурток беларускай народнай асветы», заснаваны ў 1902 г.

Чарговым паваротным момантам, які паўплываў на погляды у студэнцкім асяроддзі, сталі падзеі 1927 года. Падчас палітычных ўзрушэнняў, абумоўленых шырокамаштабнай дзейнасцю Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады, якія бударажылі беларускую студэнцкую супольнасць цягам 1926-1927 гг., адбылося рэзкае павелічэнне супярэчнасці і ўзнікненне падзеленасці паміж

---

[9] Н. А., *Студэнцкая моладзь у беларускім руху*, „Наш шлях: штомесячнік беларускага студэнцтва” 1922, №4, с. 12–13.

сябрамі арганізацыі на ідэалагічнай глебе і як вынік – празмерная палітызаванасць дзейнасці арганізацыі. Гэта не спрыяла развіццю студэнцкага руху і прывяло да занядбання ўнутранага парадку дзейнасці Студэнцкага Саюза. Таму у 1927–1931 гг. фарміруецца новая кансалідуючы праграма арганізацыі: аб'яднанне студэнцкай моладзі не зважаючы на палітычныя арыенціры, згуртаванасць вакол адной мэты дабрадзеі для Бацькаўшчыны, якой яна ўяўлялася студэнтам як, найперш, самаадданая праца на грамадскім полі на карысць народу (пазітывісцкая праца), захаванне нейтральнасці ў палітычным сэнсе, змаганне з усялякай палітычнай ангажаванасцю ў сваім асяроддзі[10].

У гэты час Акту 25 сакавіка надаецца значэнне ідэалу, які ў сціслым вызначэнне можна акрэсліць Воляй і Незалежнасцю, якіх можна дасягнуць толькі праз пазітывісцкую дзейнасць на культурна-нацыянальнай ніве. Менавіта моладзь і студэнцтва мусяць быць галоўным рухавіком гэтай працы, адмовіўшыся ад палітычных амбіцый на карысць агульнаграмадзянскага і агульнанацыянальнага дабрабыту. Гэтая думка была ўвасоблена Станіславам Станкевічам у артыкуле, прысвечаным 10-годдзю абвяшчэння БНР[11]. Таксама само свята 25 сакавіка адыгрывала ролю моцнага аб'ядноўваючага сімвалу, які для большасці студэнцтва, нягледзячы на палітычную арыентацыю, з'яўляецца прызнанай і безумоўнай памятнай датай. С. Станкевіч у сваім артыкуле спрабуе абгрунтаваць непасрэдную гістарычную датычнасць беларускага студэнцтва да падзеі 25 сакавіка 1918 г. Таму ў тэксце раскрываецца шырокі гістарычны кантэкст, праз які дэманструецца актыўная дзейнасць многіх пакаленняў беларускай моладзі, якія ў першую чаргу рупіліся пра свабоду і незалежнасць свайго народу.

---

[10] А. Мастыка, *Беларускі студэнцкі рух ва Ўніверсітэце Стэфана Баторыя ў Вільні: кароткая гісторыя й асноўныя ідэалагічныя кірункі*, „Запісы. Беларускі інстытут навукі і мастацтва" 2023, Z. 43, с. 92–93.

[11] Ст. Ст., *25.III.1918–25.III.1928*, „Студэнская думка" 1928, №2(9), с. 4–6.

Тут варта адзначыць, што С. Станкевіч з’яўляўся адным з лідараў студэнцкага руху ў канцы 1920-х – пачатку 1930-х гг. і быў прыхільнікам пазітывісцкага шляху. З 1927 г. навучаўся на гуманітарным факультэце УСБ, у 1933 г. атрымаў ступень магістра польскай філалогіі за працу «Беларускі элемент у творах Элізы Ажэшкі»[12]. Пасля абароны доктарскай дысертацыі на тэму „Беларускія элементы ў польскай рамантычнай паэзіі ч. I да 1830 года” у 1936 г., яго ўзялі на працу на кафедры славянскай філалогіі УСБ[13].

З шэрагу выбітных дзеячаў нацыянальнага руху, якія ў студэнцкія гады былі звязаны з нацыянальнымі моладзевымі таварыствамі, у іншым артыкуле С. Станкевіча вылучаецца постаць Івана Луцкевіча[14]. Такім чынам праводзіцца сімвалічная сувязь паміж віленскім студэнцтвам і адным з «айцоў» Акту 25 сакавіка, які непасрэдна звязана з Віленскім асяроддзем, адраджэнскім рухам і культурнай дзейнасцю. Відавочна, што гэтая асоба была зручнай для міфалагізацыі і ўшанавання, як ўзорная фігура, якая па свайму характару была досыць беззаганнай, бо І. Луцкевіч непасрэдна спрычыніўся да стварэння БНР, але пры гэтым яго ранні сыход з жыцця ў 1919 г. пакінуў незаплямленым яго імя ў тых палітычных спрэчках і расколах, якія напаткалі нацыянальны рух і кіраўніцтва БНР у наступны перыяд. У 1929 годзе студэнтамі праводзіцца шэраг камемаратыўных мерапрыемстваў, прысвечаных ушанаванню 10-й гадавіны смерці І. Луцкевіч, асобны нумар «Студэнцкай Думкі» быў прысвечаны памяці гэтай асобы і яго ролі для студэнцкага руху[15]. І. Луцкевіч называўся пачынальнікам беларускага студэнцкага руху і яго лідарам, прыкладам шчырага служэння студэнта-інтэлігента на-

[12] LCVA, f. 175, ap. 5IVCa, b. 1439: Stankiewicz Stanisław.

[13] T. Zienkiewicz, *Białorusini na Uniwersytecie Stefana Batorego w Wilnie: (rekonesans), „*Acta Polono-Ruthenica” 2004, T. 9, s. 179-180.

[14] Ст. Станкевіч, *Іван Луцкевіч*, „Студэнская думка” 1930, № 1(12), с. 5–11.

[15] А. Б., *Памяці Івана Луцкевіча*, „Студэнская думка” 1930, № 1(12), с. 4; Міт., *Пару слоў пра Музей Беларускага Навуковага Таварыства ім. Івана Луцкевіча ў Вільні,* „Студэнская думка” 1930, № 1(12), с. 28–30.

цыянальным інтарэсам, а таксама прадаўжальнікам ідэй К. Каліноўскага і Ф. Багушэвіча, якому іх удалося шмат у чым увасобіць у жыццё. Па колькасці спасылак і згадак, якія сустракаюцца ў студэнцкім друку, І. Луцкевіча можна бадай назваць найбольш папулярнай гістарычнай фігурай і прыкладам беспярэчнага аўтарытэту і прызнання.

У гэты ж час робіцца спроба паглыблення і пашырэння гістарычнага міфу аб уласнай студэнцкай традыцыі. Важным тэкстам, які прэтэндаваў на статус асноватворнай працы ў вызначэнні «уласных вытокаў» быў артыкул таго ж С. Станкевіча «Гісторыя Беларускага студэнцкага руху»[16]. С. Станкевіч знаходзіць ідэйныя пачаткі беларускага студэнцтва ўжо ў асяроддзі патаемных таварystваў «філаматаў і шуброўцаў» – ліберальна-асветніцкіх гурткоў, якія існавалі ў Імператарскім Віленскім універсітэце на пачатку XIX ст. Яны, як гаворыцца ў тэксце, «валодалі ў роўнай ступені глыбокім польскім патрыятызмам і яскрава праяўленым мясцовым беларускім каларытам»[17]. Як носьбіты рамантычнай шляхецкай ідэалогіі прадстаўнікі гэтай студэнцкай генерацыі не адносіліся яшчэ да беларускіх нацыянальных дзеячаў, але як асветнікі, неабыякавыя да пытання развіцця народнай культуры, прызнаваліся заснавальнікамі культурнага падмурка для развіцця беларускай літаратуры. Пачаткам уласна беларускага студэнцкага руху вызначаліся 80-я гг. XIX ст., што было звязана з дзейнасцю беларускіх нарадавольцаў і нелегальнай газеты „Гоман”. Ідэалогія народнікаў называлася блізкай беларускай нацыянальнай ідэі, як пераважна сялянскай нацыі. Далей гісторыя беларускага студэнцтва звязвалася з дзейнасцю пецярбургскага «гуртку беларускай народнай асветы» і іншымі гурткамі і зямляцтвамі, якія ўзнікаюць ва ўніверсітэцкіх цэнтрах Расіі, асабліва пасля 1905 г. Важнае месца адводзіцца і ў гэтым тэксце асобе

[16] Ст. Станкевіч, *Гісторыі Беларускага студэнцкага руху*, „Студэнская думка” 1930, № 3(14), с. 12–20.

[17] Ibidem, с. 12.

Івана Луцкевіча, як «духоўнага правадыра і кіраўніка студэнцкай дзейнасці»[18]. Узнікненне першых беларускіх партый «Беларускай рэвалюцыйнай грамады» і «Беларускай сацыялістычнай грамады» таксама атаясамлівалася з актыўнай дзейнасцю беларускіх студэнтаў па іх арганізацыі.

Такім чынам, у гэты перыяд з гістарычнай перспектывы студэнцкая моладзь называлася адным з галоўных актораў, які паспрыяў набліжэнню падзей 1918 г. і абвяшчэнню БНР, што мусіла падвышаць ролю і адказнасць ужо новай генерацыі беларускага студэнцтва і вымушае яго да самаадданай дзейнасці на карысць патрэб народа[19]. На гэтым фоне Акт 25 сакавіка рабілася кансалідуючай каштоўнасцю, а святу надавалася значэння агульнанацыянальнага значэнне, якое для большасці[20], нягледзячы на палітычную арыентацыю, з’яўлялася прызнанай і шанаванай памятнай датай.

Вясной 1931 г. група студэнтаў, сяброў БСС, пераважна юрыстаў, заснавала карпарацыю „Скарынія”, утварэнне якой было падтрымана польскімі ўладамі. Пэўная лаяльнасць да польскага ўраду і сувязь карпарацыі з прадстаўнікамі арганізацыі Цэнтрасаюз, якая лічылася паланафільскай структурай, прывялі да расколу ў студэнцкай супольнасці[21]. Сябры карпарацыі вымушаны былі сысці з шэрагаў БСС, а паміж сябрамі арганізацыямі трываў зацягнуты канфлікт. «Скарынія» хутчэй прытрымлівалася больш правых і кансерватыўных пазіцый, і мела свой уласны друкаваны орган – «Новая варта»[22]. Аднак нават пасля ўнутранага расколу, які меў ідэала-

[18] Ibidem, c. 14.

[19] S.S., *Niezale¿naœæ*, [u: Studenskaja Trybuna, №5], „Bie³aruskaja Krynica” 1933, №11(510), s. 4.

[20] Відавочна, што апроч скрайне левых сіл, камуністычнай скіраванасці, якія таксама прысутнічалі ў студэнцкім асяроддзі, але не мелі значнага ўплыву на кіраванне ці ідэалогію Студэнцкага Саюзу.

[21] T. Błaszczak, P. Tomaszewski, *Białoruska Korporacja Akademicka «Scorinia» w Wilnie w latach 1931–1934,* „Białoruskie Zeszyty Historyczne” 2013б, Z. 40, s. 142.

[22] „Novaja varta: hramadzka-navukovaja i literaturnaja časapiś Biełaruskaj studenskaj korporacyi „Skorinia”” 1931–1934.

гічныя падставы, для карпарацыі 25 сакавіка таксама заставалася цэнтральнай памятнай датай для ўшанавання. У перыяд свайго існавання прадстаўнікі «Скарыніі» бралі чынны ўдзел у мерапрыемствах прысвечаных святкаванню чарговых угодак абвяшчэння незалежнасці; карпаранты ўдзельнічалі ў іх пад сваёй «харугвай»[23] і прытрымліваліся праграмы святкавання, якую прапаноўвалі прадстаўнікі Цэнтрасаюза.

У той жа час скарынаўцы ўводзяць у сваю камемаратыўную практыку ўшанаванне іншай падзеі, якая непасрэдна датычыцца гісторыі абвяшчэння БНР і барацьбы за незалежнасць – Слуцкае паўстанне. Сябры «Скарыніі» актыўна ўключыліся ў арганізацыю ўрачыстасцей па ўшанаванні Слуцкага паўстання[24] і памяці яго ўдзельнікаў[25]. Паўстанне было антыбальшавіцкім, а паўстанцы падтрымлівалі ідэі незалежнасці БНР, але пасля адступлення пад ціскам Чырвонай арміі ўзброеныя фарміраванні паўстанцаў перайшлі на польскі бок і увайшлі ў склад Войска Польскага. У гэтым сэнсе Паўстанне было вельмі прыдатным менавіта для ідэалогіі карпарацыі, бо з аднаго боку яно адсылала да гісторыі БНР і змагання за незалежнасць, а з іншага можна было яго падаць як прыклад сумеснай барацьбы з палякамі супраць агульнага ворага – бальшавізму.

Варта адзначыць, што на пачатку 1930-х гг. святкавання ўгодак 25 сакавіка праходзіла досыць шырока ў Вільні. У гэты час святочныя акадэміі прадстаўнікамі Цэнтрасаюза ці пазней яго паслядоўніка Таварыства беларускай асветы ладзіліся асобна ад Беларускага Нацыянальнага Камітэта, які прадстаўляў большасць беларускай грамады. Такім чынам памятных акадэмій было нават

[23] Сябры карпарацыі мелі сваю сімволікі, форменныя адзнакі і фуражкі, сцяг, чым вылучаліся на фоне як сяброў БСС, так і астатняй беларускай грамады.

[24] «Novaja varta: hramadzka-navukovaja i literaturnaja časapiś Biełaruskaj studenskaj korporacyi „Skorinia"» 1934, № 3, s. 2–3.

[25] Ibidem, 1931, № 1, s. 32.

некалькі[26], асобныя імпрэзы ладзілі беларускія скаўты, святочныя набажэнствы праводзілася як у каталіцкім касцёле, так і праваслаўнай царкве, а таксама магло адбывацца ўрачыстае шэсце беларусаў па горадзе, калі на гэта была згода гарадскіх уладаў. Аднак пачынаючы з сярэдзіны 1930-х сітуацыя змяняецца, адбываецца наступ на дзейнасць нацыянальных меншасцяў, абмяжоўваецца праца на інстытуцыйным узроўні, забараняюцца публічныя мерапрыемствы, закрываюцца друкаваныя органаў і т.д. Да канца 1930-х абмежаванні пачынаюць распаўсюджвацца і на мерапрыемствы ўнутры ўніверсітэцкіх муроў. Акадэмічныя свабоду дазвалялі студэнтам і іх арганізацыям, у тым ліку аб'яднанням нацыянальных меншасцяў, праводзіць імпрэзы культурнага і асветніцкага характару, аднак калі пытанне датычылася публічнага святкавання ўгодак 25 сакавіка, то адміністрацыя ўніверсітэту не давала дазвол, відавочна, па палітычных прычынах[27].

У гэты ж перыяд адбываюцца і якасныя змены ў складзе самой беларускай студэнцкай супольнасці. Прыходзіць пакаленне, якое не мела на ўласнай памяці падзей 1918, для якіх гэта ўжо была цалкам гістарычная дата, яны былі выхаванв ў польскай дзяржаве і тут пачыналі сацыяльную актыўнасць, значная колькасць з іх скончыла польскія гімназіі, таму добра валодалі польскай мовай і арыентаваліся ў польскай культуры. Адпаведна стаўленне і ўспрыняцце Акта 25 сакавіка і паўстанне БНР для іх было ўжо іншае, мела іншую перспектыву, чым для студэнцтва 1920-х гадоў.

З сярэдзіны 1930-х вялікая ўвага БСС надаецца захаванню культурнай спадчыны, папулярызацыі нацыянальнай ідэі пад пагрозай паланізацыі і палітычным ціскам санацыйнага рэжыму. У гэтых умовах захаванне ідэалаў Акта 25 разглядаецца ўжо не проста як імкненне да незалежнасці і пабудовы ўласнай дзяржаўнасць, а за-

---

[26] *17-я ўгодкі Вялікага Акту*, „Шлях моладзі" 1935, 3(76), с. 3.

[27] *Bielaruskaja chronika*, „Шлях моладзі" 1939, №6 (148), с. 18; *Сьвяткаваньне 19-х угодкаў абвяшчаньня Незалежнасьці Беларусі*, „Шлях моладзі" 1937, №3(102), с. 6.

беспячэння існавання народу наогул, зберажэнне мовы і культуры, як асноўных фактараў існавання нацыі. Таму, па прычыне тэрытарыяльнай і адміністрацыйнай аўтаноміі ўніверсітэта, студэнцкія арганізацыя пад патранажам УСБ маглі займацца нацыянальна скіраванай актыўнасцю, прынамсі, культурнага і асветнага характару, чым БСС імкнуўся актыўна карыстацца. Ладзіліся канцэрты, прадстаўленні музыкальнай і тэатральнай мастацкай самадзейнасці. Сярод асветніцкіх задач накіраваных на шырокі нацыянальны ўзровень была культурна-асветніцкая дзейнасць у рэгіёнах: арганізацыя лекцый, культурна-забаўляльных імпрэз, найперш у мястэчках і вёсках Заходняй Беларусі[28]. Аднак да канца 1930-х магчымасці дзейнічаць па-за сценамі ўніверсітэта былі вельмі моцна абмежаваны польскай адміністрацыяй, весці культурна-асветніцкую працу ў рэгіёнах было фактычна немагчыма па прычыне забароны ці нават пераследу з боку мясцовых уладаў. У гэты час павялічыўся ўзровень польскага нацыяналізму ў студэнцкім асяроддзі, моцныя страты панеслі пазіцыі беларускіх партый, культурных і асветніцкіх арганізацый.

У сувязі з гэтым 25 сакавіка і БНР для студэнтаў ператвараецца ў гістарычны прыклад магчымасці абуджэння народу на шляху да незалежнасці ва ўмовах палітычнага прыгнёту і рэпрэсій, калі палітычнае дзейнасць немагчымая. Таму ў гэты час памяць пра БНР і Слуцкае паўстанне падаецца прыкладам рэальнай і зусім нядаўняй барацьбы беларусаў за сваю дзяржаўнасць, насуперак абвінавачанням у нядатнасці і слабасці беларускага руху, або недаразвітасці гэтай нацыі[29].

Найбольш выразна гэтыя ідэі дэкларуюцца ў часопісы з характэрнай назвай «25 сакавіка», які ўзнік ў 1936 г. У канцы 30-х гг.

---

[28] А. Мастыка, Беларускі студэнцкі саюз у культурна-асветніцкім жыцці Заходняй Беларусі (да 100-годдзя заснавання арганізацыі), „Przegląd Środkowo-Wschodni" 2021, Т. 6, с. 163–164.

[29] *Пад развагу*, [u: Studenskaja Trybuna, №1(20)], „Biełaruskaja Krynica" 1936, №9(650), s. 4; Я. Н., *25.III.1918-25.III.1937*, „Шлях моладзі" 1937, №3(102), с. 5–6.

БХД пайшла на зближэнне з камуністамі з мэтай стварэння адзінага антыфашысцкага фронту і кансалідавання беларускіх сіл усяго палітычнага спектру супраць націску з боку польскіх уладаў. Аднак на ўзроўні студэнцтва ініцыятыва не мела належнай падтрымкі. Частка хадэцкай моладзі БСС перайшла на бок Народнага фронту, утворанага ў 1936 г. кс. В. Гадлеўскім, які быў у апазіцыі да дадзенай ініцыятывы БХД. Нават адданыя прыхільнікі БХД крытычна паставіліся да ідэі супрацоўніцтва з камуністамі. Апазіцыю да прыхільнікаў БХД складала група студэнтаў, якія гуртаваліся вакол часопіса «25 сакавіка». Гэтае выданне апаніравала часопісам, якія былі пад уплывам кс. Станкевіча – «Хрысціянскай Думцы» і «Шляху Моладзі» – і прасоўвала ідэю стварэння Беларускай Народна-Радыкальнай Партыі, якая мусіла прытрымлівацца пазіцыі безумоўнай незалежнай Беларусі і недапушчэння чужых ідэалагічных уплываў[30]. Рэдактарам-выдаўцом часопіса быў Вацлаў Пануцэвіч – моладзевы лідар і прыхільнік Народнага фронту В. Гадлеўскага. Ён паступіў на юрыдычны факультэт УСБ у 1935 г., перад гэтым адслужыў тэрміновую службу ў войску і ў 1934-1935 гг. скончыў адзін курс Віленскай духоўнай семінарыі[31].

На старонках часопіса «25 сакавіка» сутнасць Акта 25 сакавіка разглядалася не толькі як ідэя дзяржаўнай і нацыянальнай незалежнасці, але як і незалежнасці і свабоды ад іншых палітычных і ідэалагічных уплываў[32]. Адначасова падзеі вясны 1918 года разглядаліся як эпахальная з'ява нацыянальнай гісторыі, якая дэманструе, што беларускі народ можа адстойваць незалежнасць і будаваць уласную дзяржаву, але ў пэўных сацыяльна-культурных умовах, якія былі створаны на папярэднім этапе нацыянальнага адраджэння. Таму для таго, каб ажыццявіць ідэі пабудовы незалежнай дзяржавы,

[30] А. Мастыка, *Беларускі студэнцкі рух ва Ўніверсітэце Стэфана Баторыя ў Вільні: кароткая гісторыя й асноўныя ідэалагічныя кірункі*, „Запісы. Беларускі інстытут навукі і мастацтва" 2023, Z. 43, с. 100.

[31] LCVA, f. 175, ap. 2VICa, b. 3999: Papucewicz Wacław.

[32] *Ad redakcyi i belaruskaha studenctva*, „25 сакавіка" 1936, № 1, с. 1–2.

мусіць адбыцца і новы этап нацыянальна-культурнага абуджэння[33]. Адпаведна, адданасць прынцыпам Акта 25 сакавіка разумелася як неабходнасць захавання беларускай тоеснасці, ідэі дзяржаўнай незалежнасці і праца па накапленню сілаў і культурнай падрыхтоўцы да нацыянальнага адраджэння. У сваёй практычнай дзейнасці прадстаўнікі супольнасці, якая гуртавалася вакол «25 сакавіка», бачылі магчымасць рэалізацыі гэтых задач праз фарміраванне так званага згуртавання Моладзі Адраджэння ці руху адраджэння, якое будзе кіравацца прынцыпамі незалежнасці і рыхтаваць адпаведную сацыя-культурную глебу[34].

Такім чынам, да 1939 года можна сказаць, што ва ўспрыманні віленскага студэнцтва значэнне і памяць пра Акт 25 сакавікаператварыліся ў агульнапрызнанае для большасці месца памяці, а адначасова ідэал-сімвал, які мусіць спрыяць захаванню беларускай ідэнтычнасці і перадачы яе наступным пакаленням да пэўнага часу і адпаведных умоваў, калі можа быць здзейснены чарговы этап нацыянальнага Адраджэння. Як мы можам прасачыць далей пасля трагічных падзей 1939 і катастрофы Другой сусветнай вайны, тыя былыя студэнты-беларусы, якія здолелі пераждыць гэты час, ці то тыя, хто выехаў ў эміграцыю і ці то нават тыя, якія засталіся ў Беларусі пад камуністычнай уладай, працягвалі менавіта ў такім ключы разглядаць прынцыпы Акта 25 сакавіка. У пэўным сэнсе яны былі носьбітамі і транслятарамі гэтых ідэй, якія шмат у чым сталі падставай для аднаўлення дзяржаўнасці і пашырэння нацыянальнай самасвядомасці сярод шырокіх мас пры чарговым уздыме нацыянальнага руху і культурнага адраджэння у канцы XX ст.

---

[33] *Biełaruskaje Narodnaje Sviata,* „25 сакавіка" 1937, № 1(2), с. 1–4.

[34] *Ideovaja deklaracyja Maładych Adradżencau,* „25 сакавіка" 1938, № 1(3), с. 1–4.

## Bibliografia

„Biełaruskaja Krynica” 1933, №11(510).

„Biełaruskaja Krynica” 1936, №9(650).

Błaszczak T., Tomaszewski P., *Białoruska Korporacja Akademicka «Scorinia» w Wilnie w latach 1931–1934*, „Białoruskie Zeszyty Historyczne” 2013б, Z. 40, s. 142.

„Golas studènta:adnadnëŭka” 1937 [„Голас студэнта: аднаднёўка” 1937].

Lietuvos Centrinis Valstybės Archyvas (LCVA), Fondas 175: Vilniaus Stepono Batoro universitetas.

Mastyka A., *Belaruski studentski rukh va Universitetsie Stefana Batoryya u Vilni: karotkaya gistoryya y asnounyya idealagichnyya kirunki,* „Zapisy. Belaruski instytut navuki i mastactva” 2023, Z. 43, c. 86–108 [Мастыка А., *Беларускі студэнцкі рух ва Ўнівэрсытэце Стэфана Баторыя ў Вільні: кароткая гісторыя й асноўныя ідэалагічныя кірункі*, „Запісы. Беларускі інстытут навукі і мастацтва” 2023, Z. 43, c. 86–108].

Mastyka A., *Belaruski studentski sayuz u kulturna-asvetnitskim zhytsi Zhakhodnyay Belarusi (da 100-goddzya zasnavannya arganizatsyi)*, „Przegląd Środkowo-Wschodni” 2021, T. 6, c. 147–168 [Мастыка А., *Беларускі студэнцкі саюз ў культурна-асветніцім жыцці Заходняй Беларусі (да 100-годдзя заснавання арганізацыі),* „Przegląd Środkowo-Wschodni” 2021, T. 6, c. 147–168].

„Naš šlâh: štomesâčnik belaruskaga studènctva” 1922, №1 [„Наш шлях: штомесячнік беларускага студэнцтва” 1922, №1].

„Naš šlâh: štomesâčnik belaruskaga studènctva” 1922, №2–3 [„Наш шлях: штомесячнік беларускага студэнцтва” 1922, №2–3].

„Naš šlâh: štomesâčnik belaruskaga studènctva” 1922, №4 [„Наш шлях: штомесячнік беларускага студэнцтва” 1922, №4].

„Studènskaâ dumka” 1924, №1 [„Студэнская думка” 1924, №1].

„Studènskaâ dumka” 1925, №1(2) [„Студэнская думка” 1925, №1(2) ].

„Studènskaâ dumka” 1925, №2(3) [„Студэнская думка” 1925, №2(3) ].

„Studènskaâ dumka” 1925, №3(4) [„Студэнская думка” 1925, №3(4)].

„Studènskaâ dumka” 1925, №4(5) [„Студэнская думка” 1925, №4(5) ].

„Studènskaâ dumka” 1925, №5(6) [„Студэнская думка” 1925, №5(6) ].

„Studènskaâ dumka” 1926, №1(7) [„Студэнская думка” 1926, №1(7) ].

„Studènskaâ dumka” 1928, №1(8) [„Студэнская думка” 1928, №1(8)].

„Studènskaâ dumka” 1928, №2(9) [„Студэнская думка” 1928, №2(9)].

„Студэнская думка” 1928, №3(10) [„Studènskaâ dumka” 1928, №3(10)].

„Studènskaâ dumka" 1929, №1(11) [„Студэнская думка" 1929, №1(11) ].
„Studènskaâ dumka" 1930, №1(12) [„Студэнская думка" 1930, №1(12) ].
„Studènskaâ dumka" 1930, №2(13) [„Студэнская думка" 1930, №2(13)].
„Studènskaâ dumka" 1930, №3(14) [„Студэнская думка" 1930, №3(14) ].
„Studènskaâ dumka" 1935, №1(15) [„Студэнская думка" 1935, №1(15) ].
„Šliach moladzi" 1935, №3(76) [„Шлях моладзі" 1935, 3(76)].
„Šliach moladzi" 1937, №3(102) [„Шлях моладзі" 1937, 3(102)].
„Šliach moladzi" 1939, №6 (148) [„Шлях моладзі" 1939, №6 (148) ].
„Šlach biełaruskaha studenta: dadatak da „Šlachu moladzi"" 1938, №1.
„Šlach biełaruskaha studenta: dadatak da „Šlachu moladzi"" 1938, №2.
„Šlach biełaruskaha studenta: dadatak da „Šlachu moladzi"" 1938, №3–4.
„Šlach biełaruskaha studenta: dadatak da „Šlachu moladzi"" 1939, №1(5).
„Šlach biełaruskaha studenta: dadatak da „Šlachu moladzi"" 1939, №2(6).
„Šlach biełaruskaha studenta: dadatak da „Šlachu moladzi"" 1939, №3(7).
„Šlach biełaruskaha studenta: dadatak da „Šlachu moladzi"" 1939, №4(8).
„Šlach biełaruskaha studenta: dadatak da „Šlachu moladzi"" 1939, №5(9).
Tomaszewski P., *Polskie korporacje akademickie w latach 1918–1939*, Torón 2011.
Turonak Y., *Pamiatsi Branislava Turonka,* [u:] *Madernaya gistoryya Belarus,* Vilnya 2006, s. 81–110 [Туронак Ю., *Памяці Браніслава Туронка,* [у:] *Мадэрная гісторыя Беларусі*, Вільня 2006, с. 81–110].
Zienkiewicz T.,*Białorusini na Uniwersytecie Stefana Batorego w Wilnie: (rekonesans)*, „Acta Polono-Ruthenica" 2004, t. 9, s. 173–183.
„25 sakavika: časapis Biełaruskich studentaŭ" 1936, №1.
„25 sakavika: časapis Biełaruskich studentaŭ" 1937, №1(2).
„25 sakavika: časapis Biełaruskich studentaŭ" 1938, №1(3).
„25 sakavika: časapis Biełaruskich studentaŭ" 1938, №1(4).
„25 sakavika: časapis Biełaruskich studentaŭ" 1939, №1(5).

## The place and importance of the memory of the March 25 Act for the Belarusian student movement in interwar Vilnius

The article attempts to examine the role and significance of the Act of March 25, 1918 and the day of declaring the independence of the Belarusian People's Republic as an important historical event for the community of Belarusian students of the Stefan Batory

University in Vilnius (1919–1939). Based on the study of the student magazine, we learn what place the independence day of the BRL occupied in the historical memory of Belarusian youth, how the ideas and principles enshrined in the Act of March 25 influenced the consciousness, ideology and political beliefs of students, and how this attitude changed under the influence of social and economic changes. political in the interwar period.
K e y w o r d s: Stefan Batory University, Belarusian student movement, Belarusian Academic Union, «Studenckaja Dumka», «Skarynia» corporation, «Novaja Varta», «Szlach Moładzi», «25 Sakavika»